**УЗВІ́ЖАННЕ**, Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга, Здзвіжанне, адно са значных хрысціянскіх свят у гонар Крыжа — сімвала выратавання чалавечага роду. Адзначаецца 27 верасня. Калі хрысціянства было прынята ў Рымскай імперыі, імператрыца Алена (маці імператара Канстанціна Вялікага, 4 ст.) здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім, каб адшукаць рэшткі крыжа, на якім на гары Галгофа быў распяты Ісус Хрыстос. Крыж быў знойдзены і пастаўлены («воздвигнут») як святыня для ўшанавання. Нар. тлумачэнне назвы свята немудрагелістае: «К Здзвіжанню ўсё павінна быць здзвінута», г.зн. усе азімыя і яравыя павінны быць звезены з поля. Восень ужо добра заявіла пра сябе: «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы». Гэта апошняе свята, якое канчаткова развітваецца з цяплом. Ключы ад лета — у шызай галачкі, якая, адлятаючы ў гэты дзень у цёплыя краі, замыкае яго і забірае з сабою ключы. Апрача адлёту птушак, у прыродзе існавала яшчэ адно «здзвіжанне» — з нор выпаўзалі ўсе змеі і збіраліся разам, каб адправіцца на зімовы сон да вясны: «Дзвіжанне — гадзюкі здзвігаюцца ў кучу». Першы вясновы і апошні восеньскі змяіныя ўкусы лічыліся самымі небяспечнымі, таму на У. пабойваліся хадзіць у лес, асабліва ж наказвалі тое дзецям. Існуе мноства легенд пра сыход змей на У. На чале змяінага шэсця заўсёды выступае *Цар вужоў* у залатой кароне (гл. *Вужова карона*), за ім — незлічоныя падданыя-паўзуны. Нягледзячы на страх перад змеямі, У. на Палессі з'яўлялася першым днём агульнага збірання журавін.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ